Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка”

Кафедра беларускага і рускага мовазнаўства

Репозиторий БГПУ

Вучэбны матэрыял па тэме

# “ПРЫМЕТНІК. ЛЕКСІКА-ГРАМАТЫЧНЫЯ РАЗРАДЫ”

па дысцыпліне “Беларуская мова”
для спецыяльнасці:
1-01 01 01 Дашкольная адукацыя

Склала дацэнт Мордас Н.Р.
Мінск
2018

ЗМЕСТ

**I. Тэарэтычны раздзел**

1.1. Прыметнік як часціна мовы

1.2. Лексіка-граматычныя разрады прыметнікаў. Якасныя, адносныя і прыналежныя прыметнікі, іх значэнне і граматычныя асаблівасці

1.3. Поўныя і кароткія формы прыметнікаў

**2. Пытанні да самакантролю ведаў**

**3. Практычнаыя заданні**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## І. Тэарэтычны раздзел

### 1.1. Прыметнік як часціна мовы

***Прыметнік*** — самастойная часціна мовы, якая мае абагульненае значэнне прыметы прадмета і дапасуецца да назоўніка ў родзе, ліку і склоне, у сказе выконвае функцыю азначэння або выказніка.

Прыметнікі могуць называць:

- якасці прадмета, уласцівасці: *блакітнае неба, паслухмянае дзіця*;
- адносіны да іншых прадметаў: *цагляны дом, жытнёвы палетак;*
- прыналежнасць пэўнай асобе або жывой істоце: *братаў сшытак, Верына пальто.*

Прыметнікі змяняюцца па родах, ліках і склонах (акрамя кароткіх форм) у залежнасці ад роду, ліку, склону назоўнікаў, да якіх яны дапасуюцца: *чырвоны абрус, чырвоная хустка, чырвонае неба, чырвоныя алоўкі*. Граматычныя катэгорыі роду, ліку і склону прыметніка не самастойныя, а залежныя: яны паказваюць толькі на сінтаксічную сувязь прыметнікаў з назоўнікамі. У множным ліку прыметнікі па родах не змяняюцца.

У сказе прыметнік бывае дапасаваным азначэннем: *Туман насоўваўся* ***белай*** *шапкай* (Лыньк); выказнікам або ўваходзіць у склад выказніка: *Зямля мая то* ***мяккая,*** *то* ***мулкая****…* (панч.); *Дзень* ***быў ціхі, сонечны*** (Б.).

### 1.2. Лексіка-граматычныя разрады прыметнікаў. Якасныя, адносныя і прыналежныя прыметнікі, іх значэнне і граматычныя асаблівасці

Паводле лексічных значэнняў, граматычных і словаўтваральных асаблівасцей прыметнікі падзяляюцца на тры разрады: якасныя, адносныя і прыналежныя.

***Якасныя*** прыметнікі абазначаюць разнастайныя прыметы, якасць прадметаў, што могуць праяўляцца ў большай або меншай ступені*: белы – бялейшы, малады – маладзейшы.* Якасці і ўласцівасці прадметаў успрымаюцца непасрэдна органамі пачуццяў: *зялёны, гучны, салодкі*; называюць прасторавыя і часавыя прыметы: *цесны, шырокі, працяглы*; выражаюць ацэнку людзей, жывёл, прадметаў: *добры, разумны, шкодны, карысны.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Якасныя прыметнікі маюць наступныя граматычныя асаблівасці, якімі яны адрозніваюцца ад адносных і прыналежных:

- утвараюць формы ступеней параўнання: *моцны – мацнейшы, наймацнейшы, больш (менш) моцны, самы моцны;*

- маюць формы ацэнкі і меры якасці: *сіні – сіненькі, малы* -- *маленькі*;

- могуць уступаць у антанімічныя адносіны: *вясёлы – сумны;*

- ад іх утвараюцца абстрактныя назоўнікі з суфіксамі –осць(-асць), -ізн, -ат-, -ын- і бязсуфіксныя: *малады – маладосць, хітры – хітрасць, сівы – сівізна, сіні – сінь,* а таксама прыслоўі на *–а: глухі – глухата, добры – дабрыня;*

- маюць поўную і кароткую формы: *смутны — смуцен, рады — рад, поўны — повен;*

- спалучаюцца з прыслоўямі меры і ступені: *вельмі ціхі, зусім малады;*

- могуць мець вытворную і невытворную аснову: *гучны, новы, праўдзівы;*

- некаторыя якасныя прыметнікі маюць кароткія формы: *мілы – міл, рады – рад.*

***Адносныя*** прыметнікі абазначаюць прымету прадмета праз яго адносіны да іншых прадметаў. Гэтыя прыметы могуць выражаць адносіны:

- да матэрыялу, з якога зроблены прадмет: *шкляны* посуд — посуд са шкла , *залаты*ланцужок — ланцужок з золата;

- да часу існавання і месца знаходжання: *учарашняя* газета, *універсітэцкая* бібліятэка;

- да дзеяння як уласцівасці: *раскладны*столік — столік, які раскладаецца;

- да прызначэння: *дзіцячы* сад, *медыцынская* карта;

- да ўдзельнікаў: *вучнёўскі* сход, *настаўніцкая* нарада;

- да тэрміну: *сутачны* паёк, *пяцігадавы* план;

- да меры і вагі: *двухметровы* дуб, *трохтонная* пліта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Адносныя прыметнікі – вытворныя словы, яны ўтвораны ад назоўнікаў, дзеясловаў і прыслоўяў: *драўляны слуп, касмічная прастора*.

Некаторыя адносныя прыметнікі пры пераносным ужыванні могуць набываць значэнне якасных: *жалезная* бочка – *жалезны* характар*, каменны* будынак – *каменнае* сэрца.У сваю чаргу якасныя прыметнікі могуць набываць значэнне адносных: *звонкі* голас і *звонкі* зычны (гук), *глухі* стук і *глух*і зычны, *лёгкае* заданне і *лёгкая* прамысловасць. Такія прыметнікі, як правіла, становяцца тэрмінамі.

***Прыналежныя*** прыметнікі абазначаюць

- прыналежнасць прадмета пэўнай канкрэтнай асобе або жывой істоце: *леснікова хата, братаў камп'ютар, буслава гняздо*;
- паказваюць на агульную родавую прыналежнасць: *ласіны след, вароніна гняздо*.

Прыналежныя прыметнікі ўтвараюцца пры дапамозе суфіксаў *-аў(ав), -оў(ов), -ёў(ёв), -еў(ев), -ін, -ын.* У назоўным склоне адзіночнага ліку яны маюць формы кароткіх прыметнікаў, а ў астатніх склонах – формы поўных прыметнікаў. Суфіксы *–аў(ав), -оў(ов), -ёў(ёв), -еў(ев)* ужываюцца пры ўтварэнні прыналежных прыметнікаў ад асноў адушаўлёных назоўнікаў мужчынскага роду: *дзядзькаў, Кастусёў, Васеў, леснікоў*. Суфіксы *-ін, -ын* ужываюцца пры ўтварэнні прыналежных прыметнікаў ад асноў адушаўлёных назоўнікаў жаночага роду: *сястрын, бабін, Наташын*. Калі аснова назоўнікаў жаночага роду заканчваецца на *к*, у прыналежных прыметніках адбываецца чаргаванне *к//ч*: *Танька – Таньчын, вавёрка – вавёрчын.*

## 1.3. Поўныя і кароткія формы прыметнікаў

Якасныя прыметнікі ў поўнай форме ў назоўным склоне адзіночнага ліку мужчынскага роду маюць канчатак **-ы(-і):***светлы, летні*; жаночага роду **ая(-яя)**: *светлая, летняя*; ніякага роду — **-ое, -ае(-яе)**: *светлае, летняе, дарагое*; у назоўным склоне множнага ліку -- **-ыя(-ія)**: *светлыя, летнія, дарагія*. Поўныя прыметнікі змяняюцца па склонах. Гэтыя формы выконваюць у сказе функцыю як азначэння, так і выказніка: *Была раняя восень. Неба, пакуль што не замутненае дажджамі, было спакойнае і яснае* (Дайн.); *Увосень і верабей багаты* (Прык.); *Для ўсякай птушачкі сваё гняздо міла* (Прык.).

***Кароткія формы*** прыметнікаў у сучаснай беларускай мове ўжываюцца рэдка. Яны не скланяюцца, але змяняюцца толькі па ліках, а ў адзіночным

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ліку -- па родах. У назоўным склоне адзіночнага ліку ім уласцівы **нулявы** канчатак у мужчынскім родзе: *чуцён, люб, дораг*; канчатак **-а** — у жаночым родзе: *чутна, люба, дорага*; **-о(-а)** — у ніякім родзе: *чутно, люба, дорага (Добрае далёка чутно);* у назоўным склоне множнага ліку -- **-ы(-і)**: *чутны, любы, дарагі*.

Якасныя прыметнікі звычайна маюць поўную форму, але некаторыя з іх зрэдку могуць ужывацца ў кароткай форме, хаця іх ужыванне у беларускай мове вельмі абмежавана. У сказе кароткія формы прыметнікаў выконваюць функцыю выказніка часцей у вершаваных творах, прыказках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**2. Пытанні да самакантролю ведаў**

1. Ахарактарызуйце прыметнік як часціну мовы.

2. Назавіце лексіка-граматычныя разрады прыметнікаў.

3. Пералічыце асаблівасці якасных прыметнікаў. Ці могуць яны пераходзіць у адносныя?

4. Чым адрозніваюцца адносныя прыметнікі ад якасных? Пры якіх умовах адносныя прыметнікі могуць ужывацца ў значэнні якасных?

5. У чым асаблівасць прыналежных прыметнікаў? Як яны ўтвараюцца?

7. Раскажыце пры поўныя і кароткія формы прыметнікаў, ахарактарызуйце іх ужыванне ў беларускай літаратурнай мове.

**3. Практычнаыя заданні**

**Заданне 1. Выпішыце з тэксту прыметнікі разам з назоўнікамі, вызначце іх разрад, граматычныя катэгорыі і сінтаксічную функцыю ў сказе.**

Сёлетні май быў халодны. У канцы красавіка на збуялую раннюю зелень спачатку пайшлі доўгія золкія дажджы, як увосень; захлюпала на полі ралля. Пасля, тыдні праз два, распагодзілася, завярнула вецер з поўначы, дыхнула сіверам, густым, калючым; па небе пагнала нізкія рудыя рваныя хмары – ударыў зазімак. Чырвоная нітачка на градусніку пад падстрэшкам апусцілася ніжэй за нуль.

Пасля пайшлі крупы, пасыпаліся з цёмных тулягоў, як з рэшата; раставалі на страсе ад скупога сонца, капаючы з доўгіх ценькіх чысценькіх ледзяшоў

халоднымі слязьмі; на двары, пазмятаныя ветрам у ямкі, ляжалі цэлы дзень да вечара.

Мерзлі раннія матылькі і пчолы. Асыпаўся ў садах белы цвет – адмёрз.

Да раніцы снег растаў. Упоўдзень аблешчылася неба, зірнула вострае гарачае сонца, заблішчалі мокрыя зялёныя аселіцы і ручаі на вуліцы, якія беглі з фермы, як вясной, размываючы пясчаную дарогу.

(І. Пташнікаў)

**Заданне 2. Утварыце ад назоўнікаў у дужках прыналежныя прыметнікі, дапасуйце іх да прапанаваных назоўнікаў. З утворанымі словазлучэннямі складзіце звязны тэкст.**

1. (*Бацька*) хата, (*матуля*) калыханка, (*бабулька*) казкі, (*дзед*) парады, (*цётка*) падарунак, (*сусед*) дзеці, (*Алеська*) сябры, (*ластаўка*) гняздо, (*бусел*) клёкат, (*настаўніца*) словы.
2. (*Васіль*) прыгоды, (*Міхась*) хутар, (*заяц*) след, (*мядзведзь*) бярлог, (*сінічка*) ціньканне, (*дзядзька*) лыжы, (*сябар*) просьба, (*вавёрка*) дупло, (*лісіца*) нара, (*бацька*) пакаранне.

**Заданне 3. Запішыце сінанімічныя прыметнікі паводле паступовага павелічэння ступені выялення якасці.**

Гіганцкі, буйны, грандыёзны, вялікі.
Трывалы, магутны, моцны, дужы.
Несамавіты, паскудны, дрэнны, благі.
Нямоглы, слабы, дохлы, аслабелы.
Агідны, непрыгожы, брыдкі, вульгарны.
Шпаркі, імгненны, хуткі, маланкавы.
Тлусты, сыты, поўны, раскормлены.
Пакладзісты, шаўковы, паслухмяны, пакорны.

**Заданне 4. Растлумачце значэнні фразеалагізмаў адным словам-прыметнікам.**

Хоць да раны прыкладай, цішэй вады, ніжэй травы, пальца ў рот не кладзі, кроў з малаком, і швец і жнец і на дудзе ігрэц, клёпак не хапае, у касцюме Адама, мала кашы есць, зорак з неба не хапае, зімой хлеба не дапросішся, як у ваду апушчаны, малако на губах не абсохла, скура ды косці, ні мычыць ні целіцца, нуль без палачкі.

*Словы для даведак*:
пра чалавека з румяным, свежым тварам; ні тое, ні гэта - ні рыба, ні мяса; ціхі, лагодны; спакойны; шмат гаворыць; няма мазгоў, неразумны; голы; мала робіць; слабы; пра звычайнага, нічым не прыкметнага чалавека; не

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўпусціць шанца; сквапны; вельмі сумны; малады; вельмі худы; спрытны; не мае значэння.

**Заданне 5. Выпішыце прыметнікі разам з назоўнікамі і вызначце іх разрад паводле значэння.**

Вясна выдалася дружнай і цёплай (М.Лынькоў). 2. Не наглядзецца на воблакі ў бязветраны дзень (І.Грамовіч). 3. Па рыбацкім звычаі лодкі пакідаюць назаўсёды там, дзе іх засцігне апошняя бяда (Я.Брыль). 4. Але ў Надзіным твары, у яе постаці было нешта ад гарманічнай закончанасці і прывабнай непаўторнасці (У.Шахавец). 5. Маладая вясна, залатая пара! Будзь красна і ясна, не шкадуй нам дабра! (Я.Колас) 6. Так і рос хлопчык на дзядзькавым хутары, з пастуха стаўшы парабчуком (К.Чорны). 7. Сэрцы чарсцвела, рабілася каменным, толькі адно кволае пачуккцё і засталося ў ім (Р.Мурашка). 8. Вясна – малады, бурлівы вір жыцця, імклівы, неспакойны рух у неакрэсленыя прасторы, шырокія, як сама воля, і няясныя, як засмужаныя далі (Я.Колас)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ